Снапкова Л.В.,
ст.выкладчык

# АГУЛЬНАДЫДАКТЫЧНЫЯ І СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ МУЗЫЧНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ НАВУЧАННЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ НАРОДНАПЕСЕННАЙ ТВОРЧАСЦІ

У сувязі з пераходам універсітэта культуры на двюхступенную падрыхтоўку спецыялістаў узнікла неабходнасць у новым курсе "Методыка выкладання спецдысцыплін". Адным з яго раздзелаў з'яўляецца раздзел аб пастаноўцы голасу. Гэты курс з'яўляецца важнейшым у комплексе профільных дысцыплін спецыялізацыі.

Падрыхтоўка будучага прафесійна адукаванага спецыяліста-выкладчыка патрабуе валодання навыкамі вакальнай работы з салістамі і ансамблямі народнай песні. Неабходна ведаць не толькі тэарэтычныя асновы методыкі выкладання пастаноўкі голасу, але ўмела выкарыстоўваць іх на практыцы.

Методыка вакальнага навучання абапіраецца на агульнадыдактычныя і спецыяльныя, уласцівыя музычнай педагогіцы, прынцыпы навучання.

Прынцып выхаваўчага навучання з'яўляецца галоўным для развіцця асобы. Выхаваўчы характар вакальнага навучання звязаны з прынцыпам навуковасці, які ў вакальнай педагогіцы асабліва важны. Студэнт павінен добра разумець сутнасць кожнай вакальнай з'явы і практычную каштоўнасць навыкаў, якія ім засвойваюцца. Свядомасць пры вакальным навучанні неразрыўна звязана з разуменнем прычын стварэння розных якасцей гуку.

На прынцып навуковасці навучання абапіраецца прынцып пасільнай цяжкасці. А гэты прынцып у сваю чаргу цесна звязяны з прынцыпам паступовасці і паслядоўнасці ў навучанні. Паступовасць і паслядоўнасць прадугледжваюць абавязковае засваенне матэрыялу ад простага да складанага, ад лёгкага да цяжкага.

Асоба кожнага студэнта вельмі індывідуальная: у кожнага свой асобы псіхалагічны склад, характар, музычныя здольнасці. Агульнае патрабаванне педагогікі аб індывідуальным падыходзе набывае важнае значэнне пры індывідуальным вакальным навучанні.

У музычнай педагогіцы асноўным з'яўляецца прынцып адзінства мастацкага і тэхнічнага бакоў навучання. Гэты спецыяльны для музычнай педагогікі прынцып надзвычай важны пры навучанні сольным спевам. Фарміраванне тэхнічных навыкаў абавязкова вядзецца ў адзінстве з эмацыянальным падтэкстам і мастацкай выразнасцю.

Спевы з'яўляюцца практычным відам дзейнасці, таму ў методыцы вакальнага навучання ў асноўным скарыстоўваюцца такія агульнадыдактычныя метады, як тлумачальна-ілюстрацыйны і рэпрадуктыўны. Тлумачальна-ілюстрацыйны метад прадугледжвае тлумачэнне матэрыялу з дапамогай вуснага слова і паказ (дэманстрацыю) прафесійнага вакальнага гучання. Пры тлумачэнні якасці пеўчага гуку, яго тэмбру шырока ўжываюцца вобразныя азначэнні. У сувязі з тым, што спевы з'яўляюцца сродкам выяўлення эмацыянальных здольнасцей чалавека, узніклі і характарыстыкі гуку, звязаныя з эмоцыямі.

Паколькі паказ гуку і патрэбных рухаў непасрэдна ўздзейнічае на органы пачуцця (слых і зрок), яго выкарыстанне цесна звязваецца са здольнасцю чалавека да пераймання. А пераймание з'яўляецца самым кароткім шляхам пры засвойванні моўных і вакальных навыкаў. Паказ з'яўляецца вельмі каштоўным пры вакальным навучанні. Такі метад даволі эфектыўны.

Да спецыяльных вакальных метадаў адносіцца і метад М.І.Глінкі. Згодна з гэтым метадам навучанне патрэбна пачынаць з сярэдзіны дыяпазону голасу, ад тонаў "без всякого усиления берущихся" (прымарных гукаў).

Не авалодаўшы вакальнымі навыкамі, будучы спецыяліст не зможа развіць вакальнае майстэрства і ў свайго вучня. Вось таму першапачатковай задачай вакальнага навучання з'яўляецца фарміраванне правільных прыёмаў пеўчай дзейнасці, якія даведзены да аўтаматызму.

Пералічаныя вышэй прынцыпы ў методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін з'яўляюцца асноўнымі ў забеспячэнні глыбокай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Такая падрыхтоўка студэнта павінна стаць фундаментам для паспяховага авалодання высокім майстэрствам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ